**Фарміраванне культурнай ідэнтычнасці на ўроках музыкі**

**Беларускія музычныя інструменты**

**Т. І. Палтарак**,
настаўнік музыкі вышэйшай катэгорыі

**На працягу першага паўгоддзя ў 4 класе вывучаецца тэма «Музычная культура Беларусі», дзе дзеці паглыбляюць веды пра жыццёвы ўклад, традыцыі і звычаі нашых продкаў, удзельнічаюць у народных абрадах і святах, асвойваюць народна-песенную творчасць.**

Каб ўрокі праходзілі больш цікава , выкарыстоўваецца віртуальная лабараторыя «Музыка, 4 клас». Шматграннасць яркіх эмацыянальных уражанняў падчас урока спрыяюць павышэнню цікавасці навучэнцаў да культуры свайго народа,фарміраванню пачуцця любові да сваёй Радзімы.

На працягу ўрока дзеці ўдасканальваюць навыкі самаацэнкі навучальнай дзейнасці, што ажыццяўляецца паэтапна, развіваюць самастойнасць.

Прапануем вашай увазе **ўрок «Беларускія музычныя інструменты»,** які спрыяе фарміраванню ў навучэнцаў культурнай ідэнтычнасці.

**Тып урока:** урок увядзення ў тэму.

**Мэта ўрока:** пашырэнне ўяўленняў вучняў пра беларускія народныя інструменты; узбагачэнне вопыту выканання, слухання і стварэння музыкі; развіццё музычных і творчых здольнасцей.

**Прагназуемы вынік:** вучні пазнаёмяцца з гісторыяй узнікнення музычных інструментаў нашай рэспублікі, даведаюцца аб іх агульных і

спецыфічных асаблівасцях, праслухаюць і ахарактарызуюць гучанне кожнага інструмента, змогуць выразна спяваць, выконваць рухі і іграць на музычных інструментах, запоўняць табліцу самаацэнкі.

Музычны матэрыял:

1. Песня «Беларусы мы» (з рэпертуара арт-групы «Беларусы», сл. А. Жукава, муз. В. Шмата.)
2. Музычнае прывітанне «Добры дзень!».
3. Урыўкі гучання беларускіх народных інструментаў.
4. Музычнае распяванне на чатыры гукі.
5. Песня «Цымбалы», словы І. Цітаўца, музыка В. Воінскай.
6. Беларуская народная песня «Зайграй жа мне, дударочку».
7. Беларуская народная песня «Ох, і сеяла Ульяніца лянок».
8. Беларуская народная песня «Сіўка-варонка».
9. Песня «Наша Радзіма», словы Л. Глінскай, музыка А. Безенсон.
10. Развітальная папеўка «Празвінеў званок».

**Абсталяванне:** музычны інструмент (баян), мультымедыйныя прэзентацыя і ўстаноўка, магнітафон, падручнік, дыдактычны матэрыял: карткі з літарамі, лісты самаацэнкі; куфар, ручнік, паляўнічы лук, ракавінка, два каменьчыкі, трансцінка, малюнкі музычных інструментаў, рознакаляровыя кружкі, дзіцячыя музычныя інструменты.

## Ход урока

### І. Арганізацыйна-матывацыйны этап

*Вучні заходзяць у клас пад песню «Беларусы мы». На стале настаўніка стаіць невялікі беларускі куфар, на дошцы вісіць беларускі ручнік.*

Музычнае прывітанне «Добры дзень!».

*Вучні сядаюць за парты.*

**Настаўнік.** Паслухайце калі ласка загадку і падумайце, пра што пойдзе гаворка на нашым уроку.

Яны ўмеюць перадаць пачуцці і падзеі,

У песнях могуць памагчы, на іх адна надзея.

Яны гучаць, а ім у адказ гудуць апладысменты.

Без іх і танца не відаць. Што гэта? (*Інструменты.*)

Беларуская музыка – гэта не толькі багацце мелодый, разнастайнасць гукаў, але і безлічоная колькасць музычных інструментаў, пра якія мы сёння даведаемся.

Тэма ўрока «Беларускія музычныя інструменты». Паспрабуйце вызначыць мэту ўрока.

**Дзеці.** Пазнаёміцца з беларускімі музычнымі інструментамі. Выканаць акампанемент да музычных твораў.

**Настаўнік.** Так, а яшчэ мы пазнаёмімся з гісторыяй узнікнення музычных інструментаў і ахарактарызуем іх гучанне.

**II. Аперацыйна-пазнаваўчы этап**

- Знаёмства з музычнымі інструментамі Беларусі

**Настаўнік.** А ці ведаеце вы, як узніклі першыя музычныя інструменты? Давайце адкрыем наш чароўны куфэрак. Паглядзіце, у ім ёсць *паляўнічы лук* – грозная зброя старажытных людзей; *ракавінка* – своеасабліва закручаны домік малюскаў і ўпрыгожванне сучаснага жылля; *два каменьчыкі* – чаму яны папалі ў чароўны куфэрак, мы зараз даведаемся; *трысціна* – непрыметная расліна, акая адыгрывае немалую ролю ў развіцці музычных інструментаў.

Вельмі даўно чалавек зразумеў, што гукі могуць быць розныя. Паляўнічы, правяраючы трываласць цецівы свайго лука, пачуў раптам, што цеціва не толькі хораша звініць, але і гучыць па-рознаму. Слабей нацягнеш – гук глухаваты, нізкі, нацягнеш мацней – гук атрымаецца высокі, доўгі , а калі паспрабаваць на лук нацягнуць не адну, а дзве, тры цяцівы, усе яны рознай даўжыні і гучаць па-рознаму, вышэй і ніжэй. Цеціва – гэта таксама струна – вось вам і струнны інструмент. Не цяжка ўявіць яго найблізкіх сваякоў.

У музеях старажытнай культуры, сярод міфаў Старажытнай Грэцыі можна сустрэць Трытона – юнака з рыбіным хвастом. Ён трубіць у ракавіну. Для такой мэты яшчэ выкарыстоўваўся і рог быка – тура. Ад рога жывёл і ракавін пайшлі медныя духавыя інструменты.

Зараз вам не цяжка здагадацца, што трысцінка – гэта таксама духавы інструмент. Да нас дайшлі чарацяныя дудачкі. Калі зачыніць усе адтуліны дудачкі пальцамі і адкрываць пальцы па чарзе, то гук будзе змяняцца. Сучасныя інструменты ўладкаваны складаней, чым дудачка, але ж і скрыпка менш падобная да паляўнічага лука.

Людзі даўно ўмелі танцаваць. Гэта былі танцы-загаворы, танцы-аповеды. Гледачы былі адначасова і ўдзельнікамі, яны суправаджалі танец рытмічнымі воплескамі. Танцы працягваліся па некалькі гадзін, рукі пачыналі балець. Але людзі знайшлі выйсце – яны ўзялі два каменьчыкі і сталі пастукваць адзін аб аднаго, а потым паспрабавалі акампанаваць на расцягнутай для прасушвання скуры. Адсюль зусім побач да барабана.

Такім чынам, камень, трысцінка, ракавіна, лук – гэта прапрадзеды нашых музычных інструментаў.

А зараз я папрашу вас самастойна пазнаёміцца з музычнымі інструментамі Беларусі і вызначыць продка кожнага інструмента. *(На працягу ўсяго ўрока дзеці працуюць з электронным сродкам навучання «Музыка.4клас.Віртуальная творчая лабараторыя». Тэма: «Музыкальная культура Беларусі».Урок 1.6: «Беларускія музычныя інструменты».)*

- Слуханне гучання беларускіх інструментаў

**Настаўнік.** Скажыце, якія ж інструменты існуюць на Беларусі?

**Дзеці.** Гармонік, дуда, скрыпка, дудка, калёсная ліра, цымбалы, бубен.

**Настаўнік.** Дзякуй. Паслухайце, калі ласка, гучанне гармоніка і знайдзіце на дошцы музычную характарыстыку гэтага інструмента.

*(Слуханне выкарытоўваецца з вышэй названага электроннага сродка навучання.)*

*Пасля праслуханага ўрыўка вучні прымацоўваюць да малюнка кожнага інструмента на дошцы адпаведныя словы.*

Гармонік: *гук яркі, сакавіты.*

Дуда: *гук гучны, пранізлівы, цягучы.*

Скрыпка: *гук прыгожы, высокі, пявучы.*

Дудка*: гук празрысты, мяккі.*

Калёсная ліра : *гук магутны, сумны, манатонны, з невялікім гугнявым (гнусавым) адценнем.*

Бубен: *гук яркі, гучны, рытмічны.*

Цымбалы: *гук гучны, параўноўваецца з разбуджаным дрымучым борам.*

Затым дзеці запісваюць у сшыткі назвы музычных інструментаў з іх характарыстыкамі.

**Настаўнік.** У кожнага інструмента – свой непаўторны тэмбр. Успомніце іх гучанне. Замацуйце свае веды з дапамогай практыкавання электроннага сродка «Музычныя інструменты».Суаднясіце гучанне інструмента з адпаведным малюнкам інструмента.

- Работа з табліцай самаацэнкі

На працягу ўрока вучні запаўняюць табліцу. Калі згодны з выказваннем – ставяць у графе «+», калі не – «–».

**Беларускія музычныя інструменты**

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Я ведаю, якую ролю адыгрываюць беларускія інструменты ў | Я адрозніваю беларускія народныя інструменты па гучанню | Я магу ахарактарызаваць гучанне беларускіх народных інструментаў | Я магу выканаць інструментальны акампанемент | Я магу прыдумаць інтструментальны акампанемент |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| жыцці беларускага народа | | | | |
| | | | | |

Настаўнік прапануе дзецям ацаніць сябе і запоўніць графу 2.

Фізкультхвілінка. Гульня «Жывое слова»

*Кожны з дзяцей атрымлівае адну літару, якая ўваходзіць у склад слова, што абазначае назву музычнага інструмента. Вучні павінны стаць так, каб можна было прачытаць яго назву.*

- Вакальная работа

1. Песня «Цымбалы», словы І. Цітаўца, музыка В. Воінскай – развучванне.

**Настаўнік.** Пра беларускія музычныя інструменты часта складаюцца песні. Вось паслухайце, калі ласка, песню «Цымбалы» на словы Івана Цітаўца і музыку Веры Воінскай. *(Выкананне настаўнікам. Характарыстыка песні.)*

Перад тым, як пачаць развучванне твора, нам неабходна разагрэць наш галасавы апарат. На склад «ма» выканаем музычнае практыкаванне. *(Распяванне, развучванне першага куплета з прыпевам.)*

2. Беларуская народная песня «Зайграй жа мне, дударочку» – працяг развучвання, ігра на дзіцячых музычных інструментах.

**Настаўнік.** Ніводны занятак нашых продкаў – няхай гэта будзе адпачынак ці праца ў полі – не абыходзіўся без музыкі. А ўжо ў святочныя ці вольныя вечары – гэта былі не проста песні, а песні-танцы, песні-карагоды. На мінулым уроку мы развучылі беларускую народную песню «Зайграй жа мне, дударочку». Давайце выканаем першы куплет. *(Замацаванне першага куплета.)*

Такія песні выконваліся пад акампанемент музычнага інструмента. А каб песня атрымалася яшчэ лепшай, а танец больш гарэзлівым,

вясёлым, музыкі аб'ядноўваліся ў ансамблі. Складаўся ансамбль не менш чым з трох інструментаў. Напрыклад: цымбалы, дудка і бубен, або: скрыпка, цымбалы, гармонік.

Людзі, якія не ўмелі іграць на музычным інструменце, але хацелі паўдзельнічаць у ансамблі, ігралі на прыладах працы, што стваралі больш каларытны гук.Такімі прыладамі маглі быць: *валак*, які ўжываўся ў апрацоўцы ільну; *верацяно*, што выкарыстоўвалася пры пранні; *шаластуны*, якія прымацоўваліся да коньскай дугі на вяселлі.

Я прапаную вам стварыць свой музычны ансамбль. На партах вы бачыце інструменты. Паспрабуйце пад песню «Зайграй жа мне, дударочку» выканаць акампанемент.

Настаўнік прапануе дзецям ацаніць сябе і запоўніць графу 4 ў табліцы самаацэнкі.

3. Беларуская народная песня «Ох, і сеяла Ульяніца лянок» – замацаванне твора з выкананнем пластычнай імправізацыі.

**Настаўнік.** Беларусы – вельмі працавіты народ. Нашы продкі руплівай працай стваралі багацце роднай зямлі. Адначасова ўзнікалі песні, у якіх адлюстроўваліся розныя віды працы. Гэтыя песні выконвалі ў час сенакосу, жніва. Давайце ўспомнім песню «Ох, і сеяла Ульяніца лянок», якую спявалі ў час цераблення лёну. *(Выкананне песні з элементамі пластычнай імправізацыі.)*

4. Беларуская народная песня «Сіўка-варонка» – выкананне песні-гульні.

**Настаўнік.** Беларускі народ вельмі любіў не толькі спяваць і танцаваць, але і гуляць.Часта гульня суправаджалася песнямі, карагодамі, ігрой на музычных інструментах. Якую музычную гульню вы ведаеце?

*Дзеці выконваюць песню - гульню «Сіўка-варонка».*

5. Песня «Наша Радзіма», словы Л. Глінскай, музыка А. Безенсон – выкананне ў характары.

**Настаўнік.** Шчырасць і працавітасць беларускага народа, прасторы роднай зямлі часта натхняюць кампазітараў і паэтаў на прыгожыя песні, якія праслаўляюць нашу Радзіму. Давайце ўстанем і выканаем у характары песню «Наша Радзіма». *(Выкананне твора.)*

**ІІІ. Ацэначна-рэфліксійны этап**

Вучні запаўняюць графу 1 табліцы самаацэнкі. Графы 3 і 5 дзеці запоўняць на наступным уроку.

**Настаўнік.** Давайце ўспомнім мэту, якую ставілі ў пачатку ўрока, паспрабуем адказаць на пытанні:

- ✓ З інструментамі якой краіны мы пазнаёміліся?
- ✓ Назавіце беларускія музычныя інстументы?

Калі вам было *цікава* на ўроку, прымацуйце да дошкі *чырвоны* кружок; калі *сумна – жоўты*; калі *абыякава – фіялетавы.*

Хутка скончыцца музычны наш урок,
Праз хвіліну зазвініць пранізлівы званок.
Сёння, вы, мае сябры, добра пастараліся
І з заданнямі ўсімі хутка вы спраўляліся.
Вашыя старанні я цаню,
За ўрок вам дзякуй гавару!

*Выконваецца развітальная папеўка.*

Празвінеў званок.
Дзінь – дзінь!
Скончыўся ўрок.

*Гучыць песня «Беларусы мы». Вучні выходзяць з класа.*

## Літаратура

1. **Беларускі дзіцячы фальклор:** вучэбнае выданне / А. М. Аляхновіч [і інш.]; пад рэд. Я. І. Шэмет. – Мінск: Беларусь, 1994. – 272 с.

2. **Романкевич, Н. В.** Развитие творческих способностей учащихся посредством использования нетрадиционных подходов к проведению

уроков музыки / Н. В. Романкевич // Мастацкая і музычная адукацыя. – 2017. – № 2. – с. 20–22.